артэфактаў мінулага (антыкварыі) праявілі актыўнасць у Брытаніі XVI – XVII стагоддзяў, якая ўвяла моду на зацікаўленасць да сваёй лакальнай гісторыі, дзе ўзніклі цэнтры антыкварнага і гістарычнага пошуку: Елізавецінскае таварыства антыкавараў (Лондан, 1585), бібліятэка Томаса Бадлея (Оксфард, 1602). Адным з першых тэарэтыкаў антыкварыянізму стаў лорд-канцлер Англіі, філосаф, гісторык і палітык Фрэнсіс Бэкан. Ён пісаў пра веды, заснаваныя на вывучэнні старажытнасцяў, што: «...старажытнасці маюць справу... з рэшткамі гісторыі..., а калі ўспаміны пра падзеі зніклі, а самі яны паглынутыя багнай забыцця... працавітыя і дасведчаныя людзі ... з настойлівасцю і скрупулёзнай дбайнасцю імкнуцца... захаваць хаця б некаторыя звесткі, аналізуючы генеалогіі, календары, надпісы, помнікі, манеты, уласныя імёны і мову, этымалогію, прыказкі, паданні, архівы і разнастайныя прылады».

### ЛІТАРАТУРА


*1. Бэкон, Ф.* О достоинстве и приумножении наук / Ф. Бэкон // Сочинения в двух томах. – М.: Мысль, 1971. – Т. 1. – С. 87–546.


## АРТ-РЫНАК ФАЛЬКЛОРНЫ

**Арт-рынак фальклорны** – *сукупнасць суб'ектаў і інстытутаў, якія ўзаемадзейнічаюць адзін з адным і якія або атрыбутуюць і ўводзяць у абарот, або спажываюць вынікі творчасці носьбітаў аўтэнтычнай фальклорнай традыцыі і тэхналогіі традыцыйных рамёстваў.* У сучаснай Беларусі прадстаўлены дзейнасцю захаваўшыхся аўтэнтычных вясковых выканаўцаў і майстроў, а таксама маладых пост-фальклорных пераемнікаў традыцыі – гараджан. Феномен вясковага маладзёжнага пераймання фальклорнага выканальніцтва і мастацкіх рамесных традыцый на дастатковым для рынкавых умоў узроўні сёння – выключэнне, а не правіла, і над гэтай праблемай варта працаваць фалькларыстам і арт-менеджэрам.

### ЛІТАРАТУРА


*1. Казаніна, В.* Да пытання вызначэння навукова-тэарэтычнага паняцця «арт-рынак антыкварных твораў мастацтва» / В. Казаніна // Роднае слова. – 2017. – №11 (359). – С. 89 – 91.


## АРТ-РЫНАК ЭТНАТАВАРАЎ

**Арт-рынак этнатавараў** – *сукупнасць суб'ектаў і інстытутаў, якія ўзаемадзейнічаюць адзін з адным, а таксама або атрыбутуюць і ўводзяць*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ